# Ніна Галіноўская: «І стыла мая дзіцячая душа…»

Літаратурная дзейнасць Ніны Галіноўскай адметная тым, што ўсю яе паэтка прысвяціла дзецям. У яе творчым багажы — 18 кніжак, адрасаваных маленькім чытачам. Плённай літаратурнай працы спрыяе тое, што Ніна Васільеўна часта сустракаецца з дзецьмі — у бібліятэках, школах, садках, лагерах адпачынку. Падчас сустрэч яна не толькі чытае свае вершы, але і расказвае пра дзяцінства, якое было апалена вайной.



Ніна Галіноўская нарадзілася на Шклоўшчыне і зусім маленькай дзяўчынкай перажыла цяжар нямецкай акупацыі. Вядома, гэту тэму паэтка не магла абыйсці ў сваёй творчасці. Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў выйшла яе кніга «Няма даравання вайне».

Ніна Васільеўна скончыла Магілёўскае педвучылішча, працавала ў дзіцячым садку і дзіцячым доме, а потым шмат гадоў — у журналістыцы.

Ніна Галіноўская — лаўрэат літаратурных прэмій імя Янкі Маўра і Васіля Віткі, а напярэдадні свайго 80-гадовага юбілею атрымала ўрадавую ўзнагароду — Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі.

**— Ніна Васільеўна, вы пішаце вершы для самых маленькіх. А як прайшло ваша дзяцінства?..**

— Маё дзяцінства дзеліцца на два перыяды. Першы перыяд — гэта вайна, якая жорстка, балюча пракацілася па маім дзяцінстве.

**— Колькі вам было гадоў, калі яна распачалася?..**

— Шосты год ішоў… Голад, акопы, зямлянкі, халадэча… Вада замярзала ў вядры. Адно было ратаванне — печ. Помніцца, як ішлі немцы — надта раўлі машыны! Побач з вёскай быў шлях… А потым, калі я ўжо падрасла, карнікі сталі прыязджаць у нашу вёску, і пачалі адбывацца драматычныя падзеі.

Вось я вам раскажу, як стралялі па мне. Пайшлі мы з мамай на луг — збіраць шчаўе. А мама і тата ў мяне шылі, у нас было дзве машынкі «Зінгер». Бацька шыў для мужчын рэчы, а мама — для жанчын і для нас, дзяцей. Яна мне пашыла сукеначку, і я апранула яе. Ідзём мы з мамай — я такая радасная!.. І раптам — гул

самалёта! Потым пачуліся стрэлы… А я яшчэ не разумею, што гэта такое. Мама: «Дзетка, бяжым да канавы!». Наша вёска называлася Вялікія Лазіцы, побач быў раскошы луг і праз яго — канава, калісьці поўная вады. Якраз у той год яна абмяльчэла, і там была твань. І мы бяжым туды хавацца. Я як глянула, што там такая твань: «Сукенку выпэцкаю!». Мама: «Дзетка, лезь!». І мяне — за руку!.. Самалёт пакружыўся-пакружыўся і адляцеў. Толькі мы выйшлі — і зноў засвістала!.. Кулі падалі ў траву вакол нас! На трэці раз — ізноў! Куля стукнула амаль ля маёй нагі. Мама схапіла мяне і кінула назад, у канаву, і цяпер мы ўжо ляжалі доўга, пакуль самалёт па-сапраўднаму не зляцеў…



*Сям'я Галіноўскіх перад вайной. Ніна — першая злева сярод дзяцей*



*Ніна Галіноўская ў маладосці*

**— Вядома, страшныя выпрабаванні для маленькага дзіцяці…**

— Аднойчы нехта прынёс вестку, што карнікі едуць! А ў нас да бабулі і дзядулі прыязджаў партызанскі атрад з лесу — грэцца, а ў хаце хаваўся Міхаіл Каржавін, камандзір партызанскага атрада. Гэта я на ўсё жыццё запомніла. У нас ён доўга хаваўся, а потым пайшоў у лес. А староста далажыў немцам! Але нас папярэдзілі.

І мама кажа: «Дзеткі, трэба ўцякаць у лес!». Толькі мы прабеглі праз свой агарод убок лесу, як раздаліся стрэлы! Я кажу: «Мама, пчолы!..». А мама: «Гэта не пчолы, а кулі! Кладзіцеся ў баразёнкі!». А бульба ўжо ладненькая была. Мы ляглі. Ляжалі-ляжалі, усталі, ужо амаль дабеглі да жыта — зноў кулі па нас! І мы зноў паваліліся і ляжалі ў барознах, пакуль не сцямнела. І калі мы выйшлі — насустрач бабуля… А ў нас так было: маміна мама воддаль жыла, а бацькава — побач, нашы хаты нават паветкай былі аб'яднаныя. «Ой, — расказвае наша мама, — па нас жа стралялі!» «А, гэта вы беглі ўбок лесу? — кажа бабуля. — На даху школы паставілі два кулямёты, і паліцаі доўга стралялі, з перапынкамі, потым сказалі: «Забілі чатырох партызан!». Значыцца, мы для іх былі партызаны: сястра, старэйшая за мяне на пяць гадоў, брат, старэйшы на два з паловай гады, я і мама — вось мы чацвяром і беглі…

**— Мусіць, на гэтым вашы страшныя выпрабаванні не скончыліся?..**

— Самы вялікі жах быў, калі прыехалі карнікі. Гэта было ў 1943 годзе. Здраднікі данеслі ў Шклоў, у камендатуру: «Панакапалі людзі акопаў — партызаны прыязджаюць і хаваюцца там». І вось — прыехалі карнікі. Наша хата была воддаль ад вуліцы, і да нас немцы прыйшлі кватаравацца. Усё гэта апісана ў маёй паэме «Пра дзяўчынку Галінку». Дзяўчынка Галінка — гэта я. Бацька ў нас быў на ўсе рукі майстар: ён і шыў, ён і мэблю вырабляў… Такую канапу зрабіў — па ёй узоры!.. І вось на гэтай канапе немец загадаў сцяліць яму. Мама пасцяліла, паклала падушку. Немец загадвае — яшчэ адну! А яны самі партызан баяліся, хаваліся. А за гэты час, як начальнікі спакойненька клаліся спаць, карнікі патрашылі акопы. Мы збіліся за печчу — у нас была руская печ, за ёю — палаці, і мы ўсе паляглі на іх, а немцы — на ложку і на канапе.

Раптам мы пачулі выбух. Мама кажа: «Пойдзем, паглядзім!». Мы — на двор. А там — зарава! І якраз у тым баку, дзе жыве бабуля, маміна маці. І тут жа выбягае немец-начальнік. Мама пытаецца: «Пан, што там?». Ён адказвае: «Нічога! Машына! Вэк, вэк!..». І загнаў нас у хату. Я, канешне, заснула, а мама потым расказвала, што не спала. Раніцай немцы з хаты з'ехалі. Збіраемся… А я малодшанькая была, паўсюды, як хвосцік, — за мамай. Зайшлі да гэтай бабулі, што побач жыла (татавай маці), а яна такая бледная-бледная!.. Гаворыць: «Мяне хацелі павесіць, але я жывая. Шукайце Юльку!». А Юлька — гэта маміна маці. Пачалі мы шукаць. А яна хавалася ў сене. Сена немцы калолі штыкамі, але штык толькі-толькі калена закрануў, скуру садраў. Мы бабулю знайшлі, пайшлі з ёю ў бабуліну хату. Выходзіць дзед — увесь пабіты-пабіты!.. Заводзіць у каморку, паказвае, што ўзарваная страха, падлога ўзарваная, усё перакапана, у кладоўцы ўсе бочкі перакуленыя… Адным словам, немцам была каманда, што сюды, у гэтую хату, партызаны заходзяць. То пасля гэтага ў дзеда пачаліся крывацёкі з рота, асабліва ўначы… Ідзём далей. А там немцы знайшлі акопы, а ход у іх быў з гумна. Карнікі спачатку пачалі крычаць. З імі былі і стараста, і паліцай. Яны ўсё паказалі дакладна, пачалі клікаць: «Выходзьце, будзем страляць!». Ніхто не выйшаў. А акоп быў на агародзе, ля гумна, гэта я добра памятаю, вялікі акоп…

**— Ніна Васільеўна, акоп — гэта, я так разумею, сховішча накрытае?..**

— Так! Усё было так зроблена, замуравана і нават яшчэ паверсе там было і пасеена. Падземны ход! Танэль… Я таксама хавалася ў такім акопе. Там так цёмна!.. Памятаю, як я баялася!

**— А хто капаў гэтыя акопы?**

— Самі і капалі. У нас брат капаў. Тады дзеці ў сем год не такія былі, як сёння. Мой брат у сем год і за плугам хадзіў, і акоп капаў…

Калі немцы ўжо паехалі, мы пайшлі па вёсцы паглядзець, што там робіцца. Вось прыйшлі мы ў хату да Галіноўскіх (таксама Галіноўскія, толькі не радня нам). Глядзім… У іх дзе дачушкі былі — Валя і Варка. Валя ціха ляжыць, а ў Варкі пена льецца з рота, і яна так цяжка дыхае… Вочы пазакатваліся… Ніколі не забуду! І стыла мая дзіцячая душа…

**— А што з імі здарылася, іх забілі?**

— Карнікі газ пусцілі ў акопы!.. Пайшлі мы ў другую хату, да Лёксіхі… Прыйшлі. У іх ужо стаяць труны, з простых дошак збітыя. І там таксама дзве дачкі ляжаць, Каця і Надзя. І маці іх адразу пасівела… У тым жа акопе былі. Гэта быў вялізны акоп — там усе хаваліся.

Пайшлі ў хату праз дарогу — там таксама дзве дачкі, Люба і Ліда, і таксама мёртвыя. Гэта ўжо шэсць дзяўчат атручаных… І сёмая — адна-адзіная дачушка ў маці, Леначка Галіноўская (таксама аднафамільцы нашы). І тая — таксама мёртвая… Яны ўсе жылі побач, таму і сядзелі разам у адным акопе. Маці іх не хаваліся — заставаліся дома. Бо немцы хапалі моладзь і адпраўлялі ў Германію. І вось такое гора страшэннае!.. Ведаеце, колькі даводзіцца выступаць і пра гэта расказваць, заўсёды па мне ідзе холад. Вось такая была страшэнная ноч!..

Тады зноў гавораць, што прыедуць карнікі. І мяне паслаў стараста клікаць усіх на сход. Я бягу: «Мама, стараста сказаў: на сход!». Мама пайшла, ну і я за ёй!.. Ідзём — праз вокны крык даносіцца з хаты! Мы хочам павярнуць, а немец — нам вінтоўкай у плечы і назад не пускае. Тады маму штурхнуў ён у хату… Ой, і цяпер памятаю той крык! Людзі ад болю крычалі: немцы іх ножкамі ад крэслаў білі, качэргамі і плёткамі. А мяне не пусцілі, і я не памятаю, як забегла дадому. Прыйшла мама — уся збітая плёткамі. А як стала распранацца — у яе ўся спіна была чорная!.. За партызан.

**— А колькі вашай маме на той час было год?**

— Маці была з 1908 года, а бацька — з 1907…

А голад які быў! Ледзве хапала ячменя да вясны… Але як толькі паспяваў шчаўлюк конскі і сваё шчаўе ішло ў пукі, мы іх шморгалі, у полі шукалі, якая засталася бульба (ужо ж пачыналі араць), перамешвалі і пяклі з гэтага так званыя плюшкі (смяецца). І гэтыя плюшкі здаваліся нейкім раем!.. І яшчэ памятаю, калі мы ў балоце хаваліся, скавароднікі пяклі: намешвалі бульбы, шчаўя, жменю мукі — і гэта называлася «скавароднік». І я памятаю, якія харошыя людзі акружалі мяне там, падносілі мне гэтыя самыя скавароднікі: «Дзетка, еш!». І я ела… А самалёты лётаюць! «Дзетка, кладзіся пад кусцік — заўважаць нас, пачнуць страляць!»



*Ніна Галіноўская, Янка Брыль, Галіна Каржанеўская*



*Ніна Галіноўская на сустрэчы з дзецьмі*

І потым доўгі час я не тое што заікалася — мне цяжка было гаварыць. Вось пытаюць што-небудзь, у мяне ў галаве словы круцяцца, а сказаць мне іх цяжка… А тыф?.. Я ж перахварэла тыфам, а лекаў не было! Вось мама расказвала: «Гарыш уся — ручнік у халодную ваду і да галавы!». З ежы — толькі бурак, рэдзька… А так хацелася чагосьці асаблівага!..

Яшчэ пра зямлянку хачу расказаць — які жах у мяне быў! Сказалі, што будуць карнікі. Ліда гаворыць: «Я не пабягу!». А я сказала: «Абавязкова пайду хавацца!». І вось ідзём мы — я, брат мой Коля, дзядзька мой Валодзя, а ён за Колю толькі на тры гады старэйшы… А ў мяне лялька была пашытая, і я такая ў яе была ўлюбёная! І я так хавала гэтую ляльку! Калі ў акоп лезлі, то я старалася і яе ўзяць. І вось у гэты наш паход узяла. Пайшлі мы ў лес, а на мяне такі змрок патыхае!.. Я баялася нават не немцаў, а таго, што могуць з лесу выйсці воўк ці мядзведзь. Ішла, і каленкі мае дрыжэлі-дрыжэлі… І вось прыйшлі, а там — такая копанка-маскіраванка. Першы Валодзя залез, потым Коля, а я баюся… Потым яны гавораць: «Ну, давай лезь!». Залезла, а там — галіны ядлоўца! Ні прасціны няма, ні падушкі, а толькі свежассечаныя елкі!.. Я потым у сваёй паэме пра гэта напісала:

Смалінка-слязінка
Упала з сасны.

Без маці ў зямлянцы
Спяць дзеці вайны.
І елкі, і сосны
Да самага ранку
Ледзь чутна спявалі
Малым калыханку…

**— Але другая частка вашага дзяцінства, якая прыпала на пасляваенныя гады, напэўна, была шчаслівейшая?..**

— Нягледзячы на тое што вайна скончылася, хлеба ўсё роўна не хапала. Але затое арабіна вырасла, якую бацька пасадзіў, — такія буйныя гронкі давала! Перад вайной ён пасадзіў перад акном ліпу, арабіну… Ліпа фігуруе ў мяне паўсюль: і ў паэме «Пра дзяўчынку Галінку», і ў вершы «Размова з бацькам»…

**— А бацька ваш загінуў?..**

— Прапаў на вайне. Пра яго самыя розныя звесткі былі. Самая першая, што невядома дзе загінуў, — з Шклоўскага райваенкамата…

Бацькава ліпа расла блізка-блізка каля акна, і калі галінка стукала ў акно, Божа мой, што ў мяне ў душы рабілася! Нейкія такія ўзнёслыя пачуцці былі, нейкае хваляванне!.. Мне хацелася спяваць — я прыдумвала словы і тут жа гэтыя словы пачынала спяваць. А яшчэ брат на дрэвы шпакоўні прыладзіў, і я любіла па дрэвах лазіць… Дык вось я скажу: гэты астравок, гэтыя дрэвы — каб іх не было, то, магчыма, у мяне і думак бы такіх узнёслых ніколі не было. Нейкія такія хвалюючыя пачуцці ўсплывалі, нараджаліся!.. І вось тут пачалі нараджацца пачуцці творчасці. Пачалі пісацца, што вы думаеце, — прыпеўкі! Гэта я была ў пятым класе. А яшчэ складала казкі і сяброўкам пераказвала.




*Кнігі Ніны Галіноўскай*




Я любіла чытаць — навучылася да школы. У самым пачатку вайны людзі беглі ў краму і хапалі ўсё: хто матэрыю, хто хлеб, хто муку, а Ліда з Колем пабеглі ў бібліятэку і прынеслі кніжкі. Памятаю, там былі і Лермантаў, і Пушкін, і Жуль Верн… Брат з сястрой любілі чытаць, і наша маці таксама. Дарэчы, яна скончыла чатыры класы — тады гэта было вельмі важна. Хацела пайсці ў медыцыну, але дзе тут быць медыцыне?.. Дык вось мама любіла, памятаю, казкі пра цара Салтана, пра царэўну і сем асілкаў… А электрычнасці ж тады не было. У нас газоўка была, «смаркачка» называлася, туды лілі газу, быў такі кноцік, і ў бутэлечцы гарэла святло… І калі я пайшла ў школу — ужо ўсе літары ведала. Восем гадоў мне было.

А што ў школе?.. У нас падручнікаў не было, але нам ішла раённая газета «Чырвоны барацьбіт». Паперы не было. Грыфільныя дошкі і грыфілі — на іх пісалі. Напісаў — сцёр, напісаў — сцёр. Школа халодная. Парт не было, клалі дошкі вялізныя-вялізныя — сталы-самаробкі на падпорах. Сядзелі таксама на дошках — сядзелі і пісалі. Вёска наша тады лічылася вялікай, школа ў нас сямігодка была, і дзеці з суседніх вёсак прыходзілі да нас…

**— А якія кніжкі мелі асаблівы ўплыў на вас у дзяцінстве?**

— Спачатку я чытала кніжкі Пушкіна, якія брат і сястра прынеслі з бібліятэкі на пачатку вайны. Таксама кніжкі Янкі Купалы былі — той жа «Курган»… І «Пяць тыдняў на паветраным шары» Жуля Верна… А ў пятым класе я ўжо чытала «Крэйцараву санату» Талстога і «Абломаў» Ганчарова. Што я там зразумела? Проста вельмі хацела чытаць.

**— А як вы пачалі ўсур'ёз пісаць вершы?**

— Калі я скончыла Магілёўскае дашкольнае педвучылішча, мела права выбару (за выдатную вучобу) і папрасілася на Брэстчыну. У Брэсце мяне запыталі: «Куды б вы хацелі паехаць працаваць?». Я сказала: «У Гарадзішчы жывуць мае дзве цёткі, я хацела б туды». А мне кажуць: «Вось там якраз адчыніўся садок:

восем кіламетраў ад Баранавічаў знаходзіцца торфапрадпрыемства «Калпеніца», а пры ім — пасёлак для супрацоўнікаў». Я паехала туды і была ў садку першая выхавацелька! Прыехала, а там усё новенькае, шмат кніжак — і Вітка, і Барто, і Міхалкоў, і Маршак, і Чукоўскі, і Благініна… Дзеткі лягуць спаць, а ў мяне ў галаве круціцца: «А я ж магу сама сачыняць!..». Хутка ў мяне для дзетак было цэлых два сшыткі вершаў на рускай мове — я іх выкарыстоўвала на ранішніках. Я не думала тады, што ўжо займаюся нейкай важнай справай — літаратурнай творчасцю. Свае вершы нікуды не дасылала, пакуль не перайшла працаваць у дзіцячы дом у Лунна, на Гродзеншчыне. Там у мяне былі 5–7-я класы, але я ўсё роўна складала вершыкі для малых дзяцей…

**— Вось надрукавалі ў газеце ваш першы верш — гэта падбадзёрыла?..**

— Гэта натхніла! Аднойчы я панесла паказаць свае вершы аднаму байкапісцу, а ён пытаецца: «А на беларускай вы можаце пісаць?». «Магу!» — адказваю. І пачала пісаць па-беларуску. Адзін верш напісала, другі… Потым уступіла ў літаб’яднанне. Я стала пісаць — у раёнку, у абласную, у «Вясёлку» асмелілася… Прынесла вершы ў «Вясёлку», паклала сакратарцы і ўцякаць!.. Тады там былі Алесь Пальчэўскі, Сяргей Грахоўскі і сам Васіль Вітка. А яны крычаць: «Паклічце, паклічце яе сюды!». Я прыйшла. Вітка прачытаў мае вершы: «Прабачце, Ніна, а гэта вы самі напісалі?..». Я так сумелася: як гэта так?! «Сама», — кажу…

**— Якая з 18 выданых кніжак вам найдаражэйшая?**

— Ведаеце, тая, што выходзіць толькі што, — самая любімая. Калі выйшлі першыя кніжкі — «Давайце пазнаёмімся», «Лясная зарадка», — я наогул радавалася, што яны выйшлі. Але ніколі такога задавальнення не было, як выйшла кніжка «Размова сняжынак». Яна так хораша аформлена! Потым зборнік «Зай-прагназіст» мне стаў больш падабацца… І так кожны раз.

**— Чаго, на вашу думку, бракуе сучаснай дзіцячай паэзіі?..**

— На маю думку, сёння мала пішацца пра тое, як трэба беражліва адносіцца да прыроды — да кветачкі, да птушачкі, да жывёліны. Каб дзіця не кідала ў іх камень. Каб не таптала кветку. Каб мела павагу да людзей. Мяне гэта ўсё кранае… Трэба навучыць дзяцей заўважаць птушачку, наглядаць, як яна даглядае дзетак, як гэтыя дзеткі вылятаюць з гнязда… Навучыць назіраць, як вясною пупышачка з’яўляецца, як з гэтай пупышачкі вылупліваецца зялёнае вочка і на сонейка глядзіць… Трэба навучыць дзяцей правільна хадзіць па зямлі!

З кнігі «Няма даравання вайне»
Ніна Галіноўская
Размова з бацькам
Мне сягоння спаўняецца столькі,
Як табе ў сорак першым было…
Сыпаў жнівень мне кветкі-вясёлкі:
Я наведала наша сяло.
Гаварыла я з ліпай тваёю,
З той, што ты пасадзіў ля акна.
Помніць ліпа расстанне з табою,
Як цябе забірала вайна.
Я цябе разумею, мой тата,
Бо з жыццёвай гляджу вышыні,

Што пакінуў ты, стаўшы салдатам, —
І сышліся цяпер нашы дні.
Захавала я крыўду на жнівень:
Падкасіў у сорак трэццім цябе.
Чую песні на сонечнай ніве,
Ды пакутуе сэрца ў журбе.
Заліваецца ў вёсцы гармонік —
Мне здаецца, ў тваіх ён руках.
Тваю музыку Шклоўшчына помніць,
Ходзяць тут яшчэ ў тых кажухах,
Што страчыў ты пад спевы завеяў,
За сялянскае дзякуй страчыў…
Родны вецер мне смутак навеяў.
Не прылегчы мне сёння ўначы.
Буду ў думках з табою я, тата,
Чым мне памяць тваю ўшанаваць?
Ты ляжыш Невядомым Салдатам —
Як магілу тваю адшукаць?..
Шчодра жнівень мне дорыць букеты,
Ды табе не магу прынясці.
Абышла, скалясіла б паўсвету —
Толькі мне да цябе не дайсці.
Да любога прыйду абеліска,
Кветкі лета на дол апушчу.
Словы смутку табе прысвячу
І табе пакланюся я нізка.
Пастаю пад бярозкай-салдаткай,
І суцішыцца сэрца біццё…
Цэлы свет ты пакінуў мне, тата,
Дзякуй, родны, табе за жыццё.
Бабуліны сны
Сняцца сны трывожныя бабулі:
Рвуцца бомбы, грозна свішчуць кулі.
Самалёты раздзіраюць неба.
Бінтаваць параненых ёй трэба.
Але рук узняць яна не можа.
Страшны грохат — танк паўзе варожы.
І бабуля кідае гранаты
І крычыць: «Атрымлівайце, каты!..».
Прачынаецца і шэпча вінавата:
— Як пазбавіцца мне ад вайны праклятай?!
Я — хутчэй у ложак да бабулі,
І пакуль мы з ёю не заснулі,
Я чытаю вершы аб вясне, аб міры,
Пра мядзведзя, зайку і пра Мыйдадзіра.
Весялее бабка, кажа мне спакойна:
— Прыйдзе час — нідзе не будзе войнаў.
Неба чорным дымам не замгліцца,
Кветкі, сонца будуць людзям сніцца.
На плошчы Перамогі
З дзядулем на плошчы
Моўчкі стаім.

І думае кожны
Аб нечым сваім.
Тужліва трапеча
Вечны агонь.
У дзеда ўздрыгнула
Злёгку далонь.
Відаць, ён прыпомніў
Далёкіх сяброў,
Што з фронту ніколі
Не прыйдуць дамоў…
І кідае водбліск
Дзядулю на скронь,
Здаецца, не гэты —
Ваенны агонь.
Шапчу я паціху:
«Дзядуля, зірні,
Як быццам трапечацца
Сцяг у агні».
А дзед у адказ мне:
— Паклон наш зямны
Усім, хто дамоў
Не вярнуўся з вайны.

Тамара Бунта, фота з сямейнага архіву паэткі і аўтара

Белорусская военная газета. – 2017. – 22 июля.